**Шаўлякова-Барзенка І.Л. (Мінск)**

## Найноўшае беларускае літаратуразнаўства: асноўныя тэндэнцыі і вынікі развіцця ў 2000-я гады

Нягледзячы на згадкі пра метадалагічны крызіс агульная рэцэпцыя беларускага літаратуразнаўства не ўтрымлівае "эсхаталагічных" ці "апакаліптычных" высноў адносна перспектыў яго развіцця. Адчуванне "калажавасці", "адвольнасці" літаратуразнаўчых доследаў апошняга дзесяцігоддзя пры панарамным поглядзе на гэты сегмент айчыннага філалагічнага дыскурсу трансфармуецца ва ўяўленне пра *адмысловую дэтэрмінаванасць* пошукаў беларускага літаратуразнаўства. З аднаго боку, іх мазаічнасць "абгрунтоўваецца" разнастайнасцю выклікаў, з якімі сутыкаецца прыгожае пісьменства ў новай інфармацыйнай рэальнасці. З другога боку, якраз трывожныя перспектывы абумоўліваюць аб'ектыўную ("міжвольную") кансалідацыю разнавектарных даследчыцкіх інтарэсаў вакол ключавой праблемы – *праблемы (сама)ідэнтыфікацыі* (аксіялагічнай, эстэтычнай, мастацкай) беларускай літаратуры ў сацыякультурнай прасторы інфармацыйнага грамадства.

Так званыя нулявыя гады не сталіся часам імпэтнага прадукавання новых канцэпцый (у галіне гісторыі альбо тэорыі літаратурнага працэсу, метадалагічнага аналізу, эстэтыкі літаратуры і інш.). Але набыткі беларускага літаратуразнаўства 2000-х гг. наўрад ці слушна ацэньваць выключна ў рэчышчы "збіральніцтва". З аднаго боку, у гэты час адбывалася ўдасканаленне інструментарыю літаратуразнаўчага аналізу, выпрацаванага на грунце трывала засвоеных (традыцыйных для айчыннага дыскурсу) ідэй, падыходаў і прынцыпаў вывучэння прыгожага пісьменства (культурна-гістарычнай школы, параўнальна-гістарычнага, тыпалагічнага літаратуразнаўства і інш.). З другога боку, у выразную паслядоўнасць складваюцца спробы выкарыстаць канцэптуальныя напрацоўкі сінергетыкі, сістэмнага, структурнага, функцыянальнага аналізу, ідэі аксіялогіі, герменеўтыкі, фенаменалогіі, рэцэптыўнай эстэтыкі, нараталогіі і інш. дзеля пошуку (як правіла, на міждысцыплінарным грунце) новых "метадалагічных рэсурсаў" для вырашэння актуальных праблем гістарычнага і тэарэтычнага вывучэння нацыянальнага мастацтва слова. Найбольш дакладна і адначасова выразна метадалагічны стан беларускага літаратуразнаўства ў гэты час можна апісаць з дапамогай філасофскай метафары І. Абдзіраловіча, што сталася адным з ключавых канцэптаў знакамітага эсэ "Адвечным шляхам" (1921): гэта абумоўлены шэрагам пазалітаратурных і ўнутрылітаратурных фактараў, скіраваны і бесперапынны рух – *рух-пошук уласнай "ліючайся*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*формы”*, якая здолела б з максімальнай арганічнасцю ўвасобіць *унікальны беларускі “змест”* (анталагічны, экзістэнцыяльны).

Згаданы пошук цягам першага дзесяцігоддзя XXI ст. вёўся (хоць і з рознай інтэнсіўнасцю) практычна ва ўсіх сегментах літаратуразнаўства: гісторыі і тэорыі літаратуры, кампаратывістыцы, тэксталогіі і інш. Так, агульную спецыфіку гісторыка-літаратурнага пошуку ў першае дзесяцігоддзе XXI ст. вызначае сканцэнтраванасць даследчыцкай увагі на *кантэкстуальным* выяўленні ўнікальнасці нацыянальнай літаратуры – праз апеляцыю да разнастайных сацыякультурных, эстэтычных, мастацкіх традыцый, сістэм, практык. Разам з тым, фокус літаратуразнаўчых інтарэсаў у параўнанні з апошнімі двума дзесяцігоддзямі мінулага стагоддзя выразна перамяшчаецца са сферы, так бы мовіць, метапраблематыкі (у дадзеным выпадку – даследавання найбольш агульных заканамернасцей, тэндэнцый развіцця нацыянальнай, рэгіянальнай, сусветнай літаратур) у прастору аўтаразнаўства.

Скрупулёзная фактаграфічнасць (у аснове якой –праца па выяўленні, апісанні, сістэматызацыі мастацкіх тэкстаў, біябібліяграфічных звестак, фактаў і інш., у тым ліку невядомых ці па розных прычынах выцесненых на перыферыю літаратуразнаўчага ўжытку) беларускімі медыявістамі розных пакаленняў прымаецца ў якасці найбольш трывалага грунту для гісторыка-культурнай рэканструкцыі развіцця нацыянальнага мастацтва слова, дзе дакладнасць арганічна спалучаецца з адмысловай захапляльнасцю: згадаем манаграфію Г. Кісялёва “Жылі-былі класікі: Хто напісаў паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе»” (2005); кнігі У. Мархеля “Шлях да Беларусі: А. Міцкевіч – прадвеснік адраджэння беларускай літаратуры” (2003), “Творчасць Уладзіслава Сыракомлі” (2005); працы М. Хаўстовіча “Айчына здалёку і зблізку: Ігнацы Яцкоўскі і Аляксандр Рыпінскі” (2006), С. Кавалёва “Літаратура Вялікага Княства Літоўскага XVI – пачатку XVII ст.: феномен культурнага памежжа” (2011) і інш.

У шэрагу аўтаразнаўчых прац (якія ўтвараюць надзвычай важкі корпус у агульным плёне гісторыка-літаратурных даследаванняў першага дзесяцігоддзя XXI ст.) перспектывы захавання каштоўнаснай ды эстэтычнай *самасці* нацыянальнага мастацтва слова як бы “змыкаюцца” з яго класічнымі вытокамі. Пры гэтым даследчыкі аддаюць перавагу своеасабліваму жанру “агледзінаў” творчай спадчыны класікаў XIX–XX ст.: “Актуальнасць традыцый: Якуб Колас у пісьменніцкім асяроддзі” (2002) В. Жураўлёва, “Кандрат Крапіва і беларуская драматургія” (2002) С. Лаўшука, “Мае Каласавіны: з вопыту вывучэння літаратурнай і гісторыка-культурнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзейнасці Якуба Коласа” (2010) М. Мушынскага, “Летапіс жыцця і творчасці Аркадзя Куляшова” (2012) Т. Голуб і інш.

Статус аднаго з прыярытэтных напрамкаў беларускай кампаратывістыкі ў першае дзесяцігоддзе XXI ст. захоўваўся за славістыкай. Пра гэта сведчаць працы, што ўвайшлі ў грунтоўнае выданне “Нарысы беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей: культурна-гістарычны і літаратуразнаўчы аспект праблемы” (2002), у зборнік матэрыялаў міжнароднай канферэнцыі “Сучасная беларуская літаратура і працэсы славянскага культурна-цывілізацыйнага ўзаемадзеяння” (2008), а таксама кнігі Т. Кабржыцкай “Дзве Радзімы – Україна і Беларусь – пад міратворчымі крыламі буслоў: нацыянальныя гісторыка-культурныя міфы, ідэйна-эстэтычныя пошукі ўкраінскай і беларускай літаратур” (2011), Г. Тычко “Творчасць Янкі Купалы і традыцыі духоўнай рэгіянальнасці ў польскай літаратуры XIX – пачатку XX стагоддзяў” (2001), публікацыі ў навуковай (у тым ліку замежнай) і літаратурна-мастацкай перыёдыцы. Нягледзячы на разнастайнасць вектараў і праблематыкі даследаў, метадалагічных падыходаў і прынцыпаў, згаданыя працы выяўляюць агульную канцэптуальную скіраванасць пошукаў айчыннай славістыкі: асэнсаванне ўзаемасувязей і ўзаемаўплываў літаратур разгортваецца ў прасторы грамадска-гістарычных, культурных, мастацкіх узаемадачыненняў славянскіх народаў, прычым найважнейшай сутнаснай характарыстыкай згаданай прасторы паўстае *дыялагічнасць*.

Калі паспрабаваць паглядзець на корпус тэарэтыка-літаратурных прац, а таксама даследаў з выразным тэарэтычным складнікам у “частотным” аспекце, становішча відавочна: пошук з прыкладна аднолькавай інтэнсіўнасцю пошук вёўся ў рэчышчах агульнай, апісальнай (аўтаразнаўчай) і гістарычнай паэтыкі. Варта мець на ўвазе, што ў літаратуразнаўчым дыскурсе 2000-х гэтыя кірункі паэтыкі, якія звычайна размяжоўваюцца ў тэарэтыка-літаратурных даведніках [1, с. 235–236], выяўляюць выразную схільнасць да *дыфузіі праблемных палёў*. Гэта яскрава прасочваецца ў працах С. Ханені “Амплітуда мастацкасці: Умоўнасць у беларускай прозе канца XX ст.” (2001), В. Шынкарэнкі “З верай у чалавечнасць: адметнасці вобразна-паэтычнай сістэмы сучаснай беларускай літаратуры” (2001), В. Жураўлёва “Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана” (2004) і інш. Адметны метадалагічны “сінкрэтызм” у асэнсаванні праблем паэтыкі абумоўлівае арыгінальнасць даследавання І. Жука “Празаічны тэкст: дынаміка рытмавага існавання” (2003), дзе рэпрэзентуецца канцэпцыя метрадынамікі празаічнага выказвання, упершыню ў айчынным літаратуразнаўстве апісваецца механізм атрымання з дапамогай камп’ютарнай апрацоўкі тэксту метрычных аўтарскіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

эталонаў, прадстаўляецца сістэма іх дынамічнага ўзаемадзеяння. Прычым каштоўнасць закладзенага ў гэтых эталонах “рытмічнага інстынкту” ўзважваецца навукоўцам на шалях, так бы мовіць, практычнага літаратуразнаўства – у аспекце дадатковых магчымасцей для аналізу асаблівасцей мастацкага стылю Я. Брыля, В. Быкава, М. Гарэцкага, І. Мележа, К. Чорнага.

У праблемным полі агульнай паэтыкі найбольшую ўвагу ў 2000-х прыцягвала да сябе жанралогія. Прычым найчасцей даследаванні паэтычных, празаічных, драматургічных жанраў разгортваліся ў гэты час у генетычным і эвалюцыйным аспектах (працы У. Каялы “Станаўленне і развіццё жанру байкі” (2002), І. Штэйнера “Балада: генезіс, эвалюцыя, перспектывы жанру” (2003), Т. Грамадчанкі “Сучасны беларускі раман: дынаміка жанру” (2006) і інш.), радзей – у ракурсах параўнальна-тыпалагічным (манаграфіі Т. Дасаевай “Максім Гарэцкі і Янка Брыль: тыпалогія малых жанраў” (2001)) і структурна-тыпалагічным (манаграфія В. Шынкарэнкі “Нястомных пошукаў дарога: праблемы паэтыкі сучаснай беларускай гістарычнай прозы” (2002)). На скрыжаванні апісальнай і гістарычнай паэтыкі побач з доследамі аўтаразнаўчага кшталту (“Паэтыка Алеся Разанава: між медытацыяй і рацыяй” (2008) А. Івашчанкі, “Паэтыка твораў Кузьмы Чорнага” (2008) А. Мельнікавай) у першае дзесяцігоддзе XXI ст. былі спробы асэнсаваць некаторыя з’явы мастацкай славеснасці ў сінергетычным ключы – як складаныя сістэмы, здольныя да самаарганізацыі і самаразвіцця, асабліва цікавай у гэтым сэнсе падаецца манаграфія В. Стральцовай “Шлях да сябе: сучасная аўтабіяграфічная проза як сістэма” (2002).

У якасці “інтэгральнай” рысы айчынных паэталагічных даследаванняў апошняга часу паўстае відавочнае імкненне спалучыць метадалагічныя магчымасці гісторыка-літаратурнага літаратуразнаўства, а таксама герменеўтычнага, фенаменалагічнага, структурна-функцыянальнага, сістэмнага аналізу – і дзеля выяўлення сутнасных характарыстык той ці іншай з’явы, і дзеля мэт прагнастычных, звязаных з вызначэннем найбольш верагодных перспектыў развіцця нацыянальнай літаратуры ў інфармацыйным грамадстве.

Нават “пункцірныя” агледзіны літаратуразнаўчых набыткаў першага дзесяцігоддзя XXI ст. даюць важкія падставы сцвярджаць, што памянёны вышэй рух-пошук уласнай “ліючайся формы” не быў ні бязмэтным, ні безвыніковым. Напачатку другога дзесяцігоддзя XXI ст. можна гаварыць не толькі пра навуковыя вынікі развіцця айчыннага літаратуразнаўства цягам 2000-х, якія, на наш погляд, звязаны перадусім з ўдасканаленнем традыцыйнага інструментарыю літаратуразнаўчага аналізу, а таксама з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

плёнными спробамі тэарэтычна засвоіць і апрабіраваць на парктыцы шэраг “інавацыйных” для беларускага літаратуразнаўчага дыскурсу ідэй, метадаў, падыходаў. Ужо зараз акрэсліваецца культурная і сацыяльная выніковасць “упартай” працы даследчыкаў розных пакаленняў у гэты перыяд: праз кніжныя выданні і публікацыі ў перыёдыцы, цягам дыскусій на канферэнцыях, семінарах, “круглых сталах”, у адукацыйным працэсе і падчас грамадскіх абмеркаванняў паслядоўна сцвярджалася ўнікальнасць, каштоўнасць беларускай нацыянальнай літаратуры як феномена, пазачасава актуальнага (і для сучаснай сацыякультурнай парадыгмы, і для новай інфармацыйнай рэальнасці).

Літаратура

1. Рагойша, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах : дапам. / В. Рагойша. – Мінск : Бел. Энцыклапедыя, 2001. – 383 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ